Добрая псіхалагічная атмасфера, зацікаўленасць навучэнцаў ходам урока падтрымлівалася дзякуючы стварэнню праблемных сітуацый, супрацоўніцтву з вучнямі.

Па выніках урока можна канстатаваць, што пастаўленыя мэта і задачы былі выкананы наступным чынам:

– *адукацыйная:* пазнаёміўшыся з біяграфчнай даведкай, вучні атрымалі заданне – прачытаць урыўкі з аповесці-казкі, даць ацэнку паводзін героя; падчас прагляду відэафільма пра У. Ліпскага дзеці занатоўвалі самыя цікавыя, на іх погляд, факты, а потым агучвалі іх для ўсяго класа;

– *развіццёвая:* падчас урока вучні па прапанаваных заданнях размаўлялі паміж сабой, ствараючы атмасферу дыялогу, адстойвалі свой пункт гледжання, слухалі меркаванні іншых, задавалі пытанні, развіваючы дыялагічнае маўленне, дасягаючы ўмення ініцыяваць узаемадзеянне з настаўнікам і аднакласнікамі. Выступаючы з адказамі, вучні развівалі маналагічнае маўленне. Кожны вучань альбо выступаў з вусным адказам, альбо рыхтаваў індывідуальнае заданне.

– *выхаваўчая:* талерантнасць складаецца з добразычлівага стаўлення да іншых людзей і іх працы, умення прыслухоўвацца і паважаць меркаванне іншых, нават калі яно супрацьлеглае. Гэтаму пяцікласнікі вучыліся, ажыццяўляючы міжгрупавую працу, выконваючы творчыя заданні. Перад вучнямі ставілася мэта размаўляць культурна, слухаць адзін аднаго.

Працаздольнасць навучэнцаў на ўроку забяспечвала за кошт выкарыстання інавацыйна-камукатыўных тэхналогій, стварэння станоўчага эмацыйнага настрою і спрыяльнай псіхалагічнай атмасферы, падбору цікавага, насычанага матэрыялу, які мае тэарэтычную, практычную і пазнавальную значнасць.

Як уяўляецца, праведзеная праца паспрыяе папулярызацыі мастацкага набытку У. Ліпскага, актывізуе ўвагу пяцікласнікаў да творчасці гэтага аўтара.

## АПАВЯДАННЕ “КВЕТКА ПАЖОЎКЛАЯ” М. ЗАРЭЦКАГА: СКЛАДАНАСЦІ КАХАННЯ “НОВАЙ” ЖАНЧЫНЫ

***А. С. Сівіцкая***

*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка (Мінск)*

*Навук. кір. – Н. В. Заяц, канд. філал. навук, дацэнт*

**Анатацыя.** Даследуецца спецыфіка раскрыцця тэмы кахання ў апавяданні “Кветка пажоўклая” М. Зарэцкага. Разглядаюцца складаныя адносіны паміж галоўнай гераіняй Марынай Гарновай і яе прыхільнікамі.

**Ключавыя словы:** М. Зарэцкі; “Кветка пажоўклая”; тэма кахання; “новая” жанчына; Марына Гарнова.

Вобраз "былых", "пажоўклых кветак" – адзін з галоўных у творчасці М. Зарэцкага. Гэты вобраз увасобіўся ў Марыне Гарновай з апавядання "Кветка пажоўклая". Некалі яна ўцякла ад бацькоў-памешчыкаў, далучылася да чырвонаармейцаў, а ў мірны час стала загадчыцай дзіцячага дома.

Гераіня паўстае загадкавай і таямнічай, прыцягвае ўвагу мужчын, аднак не адказвае ім узаемнасцю. Разам з тым у знешнасці Марыны не было нічога незвычайнага: "Здаецца, нічога асаблівага: прыемная жанчына, прыгожая, вабная. Столькі жаноцтва ў ёй, столькі ласкі – да дзяцей асабліва..." [2, с. 251]. Але характарам яна значна адрознівалася ад большасці жанчын таго часу. Гарнова займала важную пасаду, "была вядома ўсім тутэйшым «контрам» як спрытная чэкістка з пільным вокам і сталёвай цвёрдасцю" [2, с. 253].

Марына Гарнова была прадстаўніцай ідэй "новага" грамадства. На першае месца яна ставіла сваю працу, абавязак, бескампраміснасць і прынцыповасць. Ёй не ўласціва была сентыментальнасць, а каханне жанчына лічыла глупствам. Марына марыла аб бурлівым жыцці, жадала быць моцнай, не падобнай на іншых. Усе рашэнні Гарновай былі рашэннямі "новага" чалавека. Яна верыла ў тое, што мае права вяршыць лёс людзей і нават здольна адабраць жыццё ў самой сябе.

Рашэнне здзейсніць самагубства толькі здаецца моцным учынкам, але ўсю моц Марына на той момант ужо разгубіла: "Я растраціла моц сваю, той невялічкі запас, што быў у мяне. А цяпер – няма чым жыць..." [2, с. 266]. "Вобраз Марыны вызначальны тым, што праз яе смерць становіцца зразумелым кошт той светлай будучыні, у якую яе заклікалі верыць" [1], – справядліва адзначала І. Воюш. Думаецца, у гэтым свеце "новых" ідэй жанчыну магло выратаваць толькі сапраўднае каханне. Але Гарнова так і не сустрэла чалавека, побач з якім магла б захаваць сваё жыццё.

У апавяданні пісьменнік прапануе два напрамкі развіцця любоўнай лініі, звязаныя з Абшарскім і Булановічам. Абодва персанажы маюць пачуцці да галоўнай гераіні.

Некаторыя даследчыкі ставяць пытанне, ці сапраўды гэтыя мужчыны кахалі Марыну? Так, Н. Заяц заўважыла: "Арыгінальна раскрываецца ў творы тэма кахання. Парадаксальна, але ў любоўным трохкутніку «Гарнова – Арончык – Булановіч» месца каханню няма. Гарнова прымае за яго імкненне забыцца, уцячы да рэчаіснасці; Арончык – хваравітую прывязанасць да моцнай і неардынарнай жанчыны; Булановіч – цікаўнасць і жаданне акунуцца ў «нейкі асобны, дзіўны свет, у якім ён чужы і яму ўсе чужыя»" [3, с. 92]. Мусім не пагадзіцца з такой трактоўкай. Думаецца, Абшарскі і Булановіч кахалі Марыну, і спрачацца з гэтым няма сэнсу.

У тэксце выразна адлюстравана каханне Абшарскага да Гарновай. М. Зарэцкі неаднаразова акцэнтуе ўвагу на моцным, ахвярным пачуцці Абшарскага: "Я вам скажу ўсё... Бачыце, я люблю яе, дужа люблю... Мо гэта якая асаблівая любоў, не такая, як зазвычай, не ведаю... І я не магу бачыць, калі яна

мучыцца, калі пакутуе гэтак...” [2, с. 270]. Гарнова ведае пра яго адносіны, а гэта сведчыць аб тым, што пачуцці настаўніка з’явіліся не ўчора і праяўляюцца на працягу доўгага часу:

*– А гэта настаўнік адзін, Абшарскі. Кахае мяне…*

*– І не мае ўзаемнасці?*

*– Вядома. Але нішто, не дакучае, больш моўчкі глядзіць сумнымі вачмі ды ўздыхае. Я ўжо прывыкла...* [2, с. 259].

Абшарскі сапраўды меў пачуцці да Марыны. Тое, што ён заўсёды знаходзіўся побач, цярпеў кавалераў жанчыны, імкнуўся выратаваць яе, паказвае на яго сапраўднае каханне.

Таксама нельга сказаць, што Булановіч абыякава адносіўся да Гарновай. З першай сустрэчы ён не адпускаў яе ў думках, сумаваў, калі не бачыў ўсяго тры дні. Магчыма, гэта было нават каханне з першага погляду. Але гэта былі адносіны, якія яшчэ не выпрабаваны часам. Яны нагадвалі першае каханне падлеткаў, у якога, хутчэй за ўсё, няма будучыні. Закаханым было добра адзін з адным гуляць па лесе, шчыра размаўляць пра свой лёс. Але Марына кажа Булановічу, што ён для яе толькі “апошняя ўцеха”. Можна здагадвацца, што яе каханы таксама не быў гатовы ствараць сям’ю, а тым больш ахвяраваць сабой дзеля “пажоўклай кветкі”. Думка аб тым, каб ажаніцца з Гарновай, была нечаканай для Булановіча і вельмі здзівіла яго. Мужчына шмат чаго абяцаў Марыне, нават аддаць жыццё за яе (“Здаецца, што я не пашкадаваў бы для цябе нават жыцця...” [2, с. 278]), але разам з тым ён нічога не зрабіў для таго, каб ўратаваць каханую ад самагубства, таму так проста адпусціў Гарнову на той свет.

“Каханне «пажоўклай кветкі» або да яе фатальнае, небяспечнае. Яно паўсюдна, паказальна называецца аўтарам «хваравітай слабасцю», «назойлівым успамінам», «шалёнай страсцю», «ліпучымі путамі», «зеллем», «павучыннем атрутным», «дрыгвянай багнай». Сапраўднасць такіх скептычных адносін да высокіх пачуццяў выклікае сумненні, і, пры падрабязным прачытанні, становіцца зразумелым абсалютна адваротнае паказанаму стаўленне празаіка да гэтай праблемы” [1]. Гэта меркаванне І. Воюш пацвярджае выказаную раней думку: пісьменнік дае зразумець, што Марыну магло выратаваць толькі сапраўднае каханне. Але “новая”, моцная, незалежная жанчына не змагла ці не захацела вярнуцца да “былых” каштоўнасцей – такіх, як каханне і сям’я.

На наш погляд, і Абшарскі, і Булановіч сапраўды кахалі Гарнову, але іх пачуццё не змагло вярнуць да жыцця жанчыну, якая не жадала выратоўвацца.

## Літаратура


1. Воюш, І. Д. Жанчына ў непрытульным свеце: жаночыя вобразы ў прозе Міхася Зарэцкага [Электронны рэсурс] / І. Д. Воюш // Электронная библиотека БГУ. – Рэжым доступу: https://elib.bsu.by/handle/123456789/18096. – Дата доступу: 17.03.2022.

2. Зарэцкі, М. Кветка пажоўклая : апавяданні, аповесць / М. Зарэцкі ; уклад. Н. Семашкевіч. – Мінск : Маст. літ., 2002. – 431 с.

3. Заяц, Н. В. М. Зарэцкі ў школе: ідэйны змест апавяданняў “Ворагі” і “Кветка пажоўклая” / Н. В. Заяц // Язык и межкультурные коммуникации : сб. науч. ст. / Белорус. гос. педагог. ун-т ; редкол. В. Д. Стариченок [и др.] ; отв. ред. В. Д. Стариченок. – Минск, 2019. – С. 89–93.